# «Крывавы аўторак»
# (балада)

За яблыкам цягнулася рука
Дзіцяткі, ну амаль што немаўляці.
З усмешкаю глядзела на сынка
З акенца маладзенькая шчэ маці.

Самотна адляталі жаўрукі,
І ім ў дагонку галасіла рэха.
З далонямі малюсенькай рукі
Гуляла тая яблыня-пацеха.

І хараша на сэрцы, і журба:
Сынок – такі гарэза, усё смяецца,
А дзесьці йдзе страшэнная вайна,
І з бацькам больш ніколі не сустрэцца.

І вось гудуць машыны з чужыны,
Навезлі сюды карнікаў – халеру.
Гарэць маўкліва пашы збажыны,
Галгофай сталі родныя кватэры.

Зайшлі ўдваіх, прыселі адпачыць,
Ды з відамі на маці паглядаюць.
А там дзіця заходзіцца, крычыць,
Бо ў хату немаўлятка не пускаюць.

Усё цішэй дзіцячы галасок,
А ў хаце – мітусня і злое дзейства,
У дзверы ціха просіцца сынок,
Не ведае пра гэта ліхадзейства.

У роспачы да яблынькі пайшоў,
Яна яму галінкі нахіліла,
І побач з ёй ён яблык свой знайшоў,
Такі прыгожы і такі нямілы.

Тут дзверы расчыніліся на раз,
І выйшлі тыя «людзі» на падворак.
Балючы і праўдзівы мой расказ,
Крывавы і нялюдскі той аўторак.

І ціхенька ў хату крочыў сын,
А маці на падлозе ледзь жывая.
А ні людзей няма, ні мітусні,
На ложку ціха маці памірае.

Абняў яе за шыю жаўручок,
Далонямі ёй вочы выцірае.
Яму ўсяго другі ішоў гадок,
І ў грудзях пяшчотай сэрца грае.

Тут нехта ў хату дзверы адчыніў,
На хлопчыка нялюдскі паглядае.
«Навошта ты матулечку забіў?» –
Ён у вачах блакітненькіх чытае.

Знянацку тут падскочыла дзіця,
На «звера» замахнулася рукою.
І моцна немца біла немаўля,
З пакрыўджанай, параненай душою.

За ручку падхапіў яго фашыст
І хутка-хутка вынес на падворак,
Узяў стрэльбу і прыкрыкнуў сябру: «Schissen!»
І двойчы стаў крывавым той аўторак.

Раптоўна абарвалася жыццё
Таго асірацелага палетка.
Адзіная, хто ведае пра ўсё,
Ты, яблынька, вайны нямая сведка.

Твой яблык, не пакусаны нідзе,
Сціскаў у руцэ той хлопчык нежывенькі.
І вочкі, не пазнаўшыя надзей,
Блішчэлі дробнай кропелькай слязінкі.